На працягу стагоддзяў межы гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў мяняліся, аднак гэта не парушала пераемнасці гістарычных традыцый, якія ва ўмовах патрыярхальнага ўкладу выконвалі жыццёва важную камунікатыўную ролю, замяняючы пісьмовую культуру.

Гісторыка-этнаграфічны рэгіён – рэгіён, што вылучаецца на якой-небудзь тэрыторыі паводле комплексу этнакультурных прыкмет: асаблівасцей этнічнай гісторыі, характару рассялення, гаспадарчых заняткаў і прылад працы, народнай архітэктуры, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, традыцыйнага адзення, фальклору, мясцовых гаворак і інш.

Гісторыка-этнаграфічныя рэгіёны адлюстроўваюць варыяцыйнае багацце і разнастайнасць беларускай народнай культуры, яе творчыя магчымасці і самадзейны характар.

***Паазер'е, Падзвінне***, – гісторыка-этнаграфічны рэгіён, які займае большую частку Віцебскай вобласці.

На паўднёвым усходзе па дняпрова-дзвінскім водападзеле мяжуе з Падняпроўем, на поўдні і паўднёвым захадзе па ўмоўнай лініі на поўнач ад Барысава і Лагойска праз Паставы – з Цэнтральнай Беларуссю і Панямоннем. Як гісторыка-этнаграфічны рэгіён адпавядае асноўнаму масіву старажытнай Полацкай зямлі.

Для Паазер'я разам з часткай Падняпроўя на працягу сярэдняевякоўя і да 2-й паловы XIX ст. захавалася этнаграфічная назва Белая Русь, якая паступова была пашырана на ўсю тэрыторыю сучаснай Беларусі.

У выніку падзелаў Рэчы Паспалітай (1772 і 1793 гг.) Паазер'е было далучана да Расіі і ўваходзіла ў склад Полацкай, з 1796 г. – Беларускай, а з1802 г. – Віцебскай губерняў; заходняя частка ўваходзіла ў Віленскую губерню.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі і ўтварэння Беларускай ССР усходняе Паазер'е з 1924 г. у складзе БССР; заходняя(левабярэжная) частка Паазер'я ўз'яднана з БССР у 1939 г.

Традыцыйна-бытавая культура рэгіёна складвалася на працягу многіх стагоддзяў, адлюстроўваючы як агульнабеларускія рысы, так і спецыфіку мясцовых гістарычных і экалагічных умоў.

Этнічнай своеасаблівасцю вызначаецца народнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, якое з'яўляецца важнай часткай нацыянальнай мастацкай культуры Беларусі.

***Ткацтва*** – самы распаўсюджаны від беларускага народнага мастацтва.

Сваё значэнне ручное ткацтва захоўвала да пачатку XX ст. Да гэтага часу патрабаванні большай часткі насельніцтва ў тканінах задавальняліся за кошт тканін, якія выраблялiся ў хатніх умовах.

Ткацтва цесна звязана з гісторыяй народа і з'яўляецца каштоўным матэрыялам пры даследаванні этнічных працэсаў мінулага, этнакультурных узаемасувязяў беларусаў з іншымі народамі.

Ткацтва да апошняга часу не з'ўлялася прадметам спецыяльнага даследавання. Асобныя звесткі аб ім раскіданы ў рознага напрамку публікацыях, дзе ткацтва разглядаецца разам з іншымі элементамі матэрыяльнай культуры.

Традыцыйныя тканіны Віцебшчыны, як і народнае адзенне, па-мастацку адлюстроўваюць складаны працэс культурных дачыненняў і ўзаемаўплываў этнасаў, якія спрадвеку жылі на гэтай зямлі. Гэты рэгіён заўсёды з'яўляўся тэрыторыяй міжэтнічных кантактаў з рускім этнасам і балцкімі народамі.

У тканінах з заходніх раёнаў вобласці назіраецца больш рысаў суседняга этнарэгіёна Панямоння. Прычына гэтага ў тым, што амаль да сярэдзіны ХХ стагоддзя заходнія раёны Віцебскай вобласці тэрытарыяльна і гістарычна адносіліся да Віленшчыны і маюць у сваёй культуры моцны падмурак традыцый балцкага паходжання, што не магло не адбіцца на мастацкіх народных тканінах. Акрамя таго, культура латышоў і літоўцаў, якія жывуць побач, таксама аказала ўплыў.

Тканіны, што паходзяць з Дубровенскага і Аршанскага раёнаў па левабярэжжы Дняпра, нясуць на сабе праявы арнаментальнага і мастацка-тэхналагічнага комплексу традыцыйнага тэкстылю Падняпроўя, характэрныя для тканін Магілёўшчыны.

У мастацкіх адносінах традыцыйныя тканіны Віцебшчыны складаюць адметную групу, асаблівасці якіх вылучаюць іх сярод народнага тэкстылю іншых рэгіёнаў Беларусі.

Разам з тым, традыцыі хатняга ткацтва і вышыўкі на Віцебшчыне ўжо адышлі ў нябыт. У віцебскіх вёсках ужо не ткуць, а вышыванне існуе як від сучаснага рукадзелля і ўжо даўно страціла свае адметныя арнаментальныя і мастацка-тэхналагічныя традыцыі, якія былі ўласцівы сялянскай культуры рэгіёна на пачатку ХХ стагоддзя.

Распаўсюджанне на Віцебшчыне прамысловага тэкстылю цэнтральных губерняў Расіі з другой паловы ХІХ стагоддзя звужвала мясцовы выраб самаробных сялянскіх тканін. Скарачэнню вясковай вытворчасці тканін на пачатку ХХ стагоддзя садзейнічала і тое, што гэты рэгіён адным з першых на Беларусі апынуўся ў сферы ўздзеяння капіталістычнай фабрычнай прамысловасці. Гэтаму спрыяла блізкасць рэгіёна да такіх буйных прамысловых цэнтраў, як Масква, Пецярбург, Рыга, наяўнасць добрых шляхоў рачных і чыгуначных зносін з імі.

У параўнанні з іншымі раёнамі Беларусі, больш развітымі, былі ў Віцебскай губерні саматужныя ткацкія промыслы, якія ў некаторай ступені задавальнялі патрэбу ў тканінах у гарадах і на вёсцы. Пачынаючы з 1880-х гадоў і да пачатку першай сусветнай вайны тут дзейнічалі некалькі ткацкіх школ-майстэрняў:

– школа ткацтва Ганны Мооль у маёнтку Юзэфінава Дзвінскага павета, заснаваная ў 1889 годзе.

– ткацкая школа з карункавым аддзяленнем паблізу Лёзна. У 1911–1912 гадах.

– ткацкія школы-майстэрні ў Дрысвятах і Мурмішках Браслаўскага павета. З 1912 года.

– ткацка-дывановая майстэрня ў Лепелі У 1914 годзе.

На ўсходнюю частку Віцебшчыны распаўсюджвала свой уплыў Сычоўская ткацкая школа княгіні М. А. Урусавай на Смаленшчыне.

У 1920–1930-я гады заходняя і ўсходняя часткі рэгіёна развіваліся ў розных сацыяльна-палітычных і гаспадарча-культурных умовах. Гэта стала прычынай рознай ступені захаванасці традыцыйнай культуры.

У Заходняй Беларусі, якая пасля Рыжскай дамовы 1921 года апынулася ў складзе Польшчы да канца 1930-х гадоў, працягвалася развіццё аўтэнтычных мастацкіх традыцый стварэння ручнікоў-набожнікаў. Быў пашыраны ткацкі промысел.

Пасля першай сусветнай вайны адрадзілася ткацкая майстэрня ў Дрысвятах, у 1930-я гады ўзнік ткацкі цэнтр у Опсе.

Апошняя вайна загубіла каштоўны пласт традыцыйнай матэрыяльнай культуры і народнага мастацтва – узоры адзення і тэкстылю месцамі амаль цалкам былі знішчаны. У раёнах, дзе ішлі найбольш буйнамаштабныя ваенныя дзеянні і меўся моцны партызанскі рух: Талачынскім, Чашніцкім, Ушацкім, Лепельскім, Сенненскім, Віцебскім, Полацкім, Лёзненскім, Расонскім – традыцыйныя тканіны амаль не захаваліся. Не адрадзілася сялянскае рамяство ткацтва тут і пасля вайны. Таму нам зараз нельга дастаткова поўна ўявіць карціну рэгіянальных традыцый і лакальных асаблівасцей народных тканін Віцебшчыны.

Лепей захаваліся традыцыі ткацкага рамяства ў першыя пасляваенныя гады ў заходніх раёнах вобласці. У 1950– 1970-я гады вясковае ткацтва тут засяродзілася пераважна на вырабе тканін утылітарна-дэкаратыўнага прызначэння: настольнікаў, посцілак, дываноў, ходнікаў. Досыць актыўныя асяродкі

ткацкага рамяства існавалі ў Верхнядзвінскім, Міёрскім, Шаркаўшчынскім, Пастаўскім раёнах.

У Верхнядзвінскім раёне з канца 1960-х да сярэдзіны 1980-х гадоў у хатніх умовах працавала шмат ткачых-надомніц Верхнядзвінскай фабрыкі мастацкіх вырабаў.

У 1980-я ў Докшыцкім, Глыбоцкім, Браслаўскім раёнах працавалі асобныя ткачыхі, якія выраблялі пераборныя посцілкі і кілімы на заказ.

Асартымент узорных тканін, якія выраблялі вясковыя ткачыхі, у гэты перыяд значна звужаецца ў параўнанні з першымі дзесяцігоддзямі ХХ стагоддзя.

*Калекцыя тканых вырабаў у запаведніку* пачала складвацца з 1956 года, калі ў Краязнаўчым музеі апынуліся 2 фрагметы тканіны з Глыбоцкага р-на к. ХІХ – п. ХХ ст. З гэтага года да 1998-га, года адкрыцця музея ткацтва, у фондах запаведніка знаходзілася 225 народных тканін (за 42 гады, крышку болей за 5 прадметаў штогод). З 1999 па 2006 гг. у фонды запаведніка паступіла ўжо115 тканых прадметаў (за 7 гадоў, амаль па 16,5 прадметаў штогод).

На жаль, страчаны ўжо той час, калі была магчымасць набыць найцікавейшыя тканыя вырабы. Аднак не гледзячы на цяжкасць іх збору, зараз прасочваецца добрая тэндэнцыя. Гэта звязана з тым, што пошук экспанатаў стаў больш мэтанакіраваным (ёсць музей).

Зараз калекцыя тканых вырабаў у фондах запаведніка налічвае 340 экспанатаў. З іх 287 знаходзяцца на пастаянным захоўванні, 23 – у дапаможнам фондзе і 40 – на часовым захоўванні, яны паступова будуць пераведзены ў асноўны фонд. Сярод гэтых прадметаў не толькі ручнікі (144, з іх 2 фрагменты), посцілкі (88, з іх 1 фрагмент), абрусы (57), але гэта і тканыя палавікі, сурвэткі, фіранкі, прасціны і іншыя тканыя вырабы народнага побыту (51). У экспазіцыі музея знаходзіцца больш за 80 адзінак народных тканін .Калекцыя прадстаўлена наступнымі раёнамі:

| | |
|---|---|
| Аршанскі | 2 |
| Бягомльскі | 1 |
| Бешанковіцкі | 5 |
| Браслаўскі | 1 |
| Верхнядзвінскі | 19 |
| Глыбоцкі | 28 |
| Докшыцкі | 41 |
| Лепельскі | 1 |
| Міёрскі | 54 |
| Пастаўскі | 22 |
| Полацкі | 99 |
| Расонскі | 8 |
| Сенненскі | 1 |
| Талачынскі | 1 |
| Ушацкі | 13 |
| Чашніцкі | 1 |
| Шаркаўшчынскі | 15 |
| Шумілінскі | 3 |
| Гомельская вобл. | 10 |
| Мінская вобл. . | 8 |
| Магілёў | 5 |
| раскопкі | 1 |
| Усяго | 340 |

На жаль, не ва ўсіх прадметах вядомы імёны майстроў, прыблізна названы не толькі год вырабу, але нават і месца.

Сістэматызаваць тканыя вырабы можна наступным чынам:

– па відах ткацтва: ручнікі, посцілкі, абрусы і інш. тканыя вырабы.

Кожны з гэтых відаў падзяліць:

– па функцыянальнай прыкмеце,

– па месцы вырабу,

– па тэхніках ткацтва.

Калекцыя тканых вырабаў будзе прадстаўлена вялікім каталогам «Народнага тэкстылю Паазер'я», які будзе складацца з асобных каталогаў ручнікоў, посцілак, абрусаў. Дадатковы каталог будзе па прыладах працы, у які будуць уваходзіць прылады для апрацоўкі лёну, воўны і ткацкія прылады.

**Каталог посцілак з музейных збораў НПГКМЗ**

Посцілкі ігралі значную ролю ва ўпрыгожванні інтэр'еру і ўбранні ложка.

У адрозненне ад ручнікоў і абрусаў, якія ткалі толькі з лёну, для посцілак выкарыстоўвалі яшчэ і воўну. Найбольшую каштоўнасць прадстаўляюць посцілкі з воўны і паўвоўны.

У калекцыі НПГКМЗ налічваецца 87 посцілак, 1 фрагмент посцілкі і 14 палоцен на посцілкі. Прадстаўлены наступныя раёны:

| | |
|---|---|
| Верхнядзвінскі | 8 |
| Глыбоцкі | 11 |
| Гомельская вобл. | 3 |
| Докшыцкі | 26 |
| Міёрскі | 15 |
| Мінская вобл. | 2 |
| Пастаўскі | 7 |
| Полацк | 25 |
| Расонскі | 1 |
| Шаркаўшчынскі | 4 |
| **Усяго** | **102** |

Як бачым, калекцыя посцілак Паазер'я далёка не поўная. Найбольшая колькасць посцілак прадстаўлена Докшыцкім і Полацкім раёнамі. Няма Ушацкага, Лепельскага, і ўвогуле ўсходняя частка нашага рэгіёна зусім не прадстаўлена.

Прычыны гэтага (заходняя і ўсходняя часткі вобласці развіваліся ў розных сацыяльна-палітычных і гаспадарча-

культурных умовах, ваенныя дзеянні, што вяліся на тэрыторыі падчас ВАВ) былі асветлены ва ўступнай частцы.

*Адбор прадметаў* для каталога будзе ўлічваць наступныя параметры:

час вырабу,

навуковую каштоўнасць,

майстэрства выканання,

ступень захаванасці.

*Структура каталога* будзе выглядаць такім чынам (прыкладна):

Сістэматызацыя будзе весціся:

– па функцыянальных адзнаках, тут можна вылучыць посцілкі святочныя і паўсядзённыя;

– па месцы вырабу, посцілкі будуць прадстаўлены з заходняй і ўсходняй часткі Паазер’я і асобна вылучаны посцілкі Полацкага р-на;

– па тэхніцы выканання будуць прадстаўлены чатырохнітовыя, пераборныя і шматнітовыя посцілкі.

Каталог будзе дапоўнены фотаздымкамі посцілак, тэрміналагічным слоўнікам з апісаннем тэхнікі ткацтва, біяграфічнымі даведкамі і спісам літаратуры.

Улічваючы існаванне музея традыцыйнага ткацтва Паазер’я, калекцыя посцілак спраўджвае сваё існаванне і магчымасць папаўнення.

Далейшы збор экспанатаў можна весці ўжо больш мэтанакіравана па тых раёнах, адкуль у нас мала народных тканін.

Састаўленне каталога можа стаць той прыступкай, якая дапаможа больш дасканала вывучыць нашы фонды, каб тым, хто будзе працаваць пасля нас, было прасцей.

**Літаратура**

**Восточнославянский этнографический сборник:** Очерки народной материальной культуры русских, украинцев и белорусов в XIX – начале XX в. Том XXXI. – М.:Изд-во АН СССР, 1956.

**Курилович А.Н.** Белорусское народное ткачество. – Мн.: Навука і тэхніка, 1981.

**Народныя мастацкія рамёствы Беларусі /** Уклад. Я.М. Сахута. – 2-е выд. – Мн.: Беларусь, 2001.

**Помнікі этнаграфіі:** Методыка выяўлення, апісання і збірання / Пад рэд. В.К. Бандарчыка. – Мн.: Навука і тэхніка, 1981.

**Промыслы і рамёствы Беларусі /** В.К. Бандарчык і інш. – Мн.: Навука і тэхніка, 1984.

**Селивончик В.И.**, Винникова М.Н. Возрождение ремесла: Пособие по ручному узорному ткачеству. – Мн.: Полымя, 1993.

**Традыцыйная мастацкая культура беларусаў:** У 6 т. Т. 2. Віцебскае Падзвінне / Т.Б. Варфаламеева, А.М. Боганева, М.А. Козенка і інш.; Склад. Т. Б. Варфаламеева. – Мн.: Бел. навука, 2004.

# Газеты 1946–1979 гг., надрукаваныя на тэрыторыі Беларусі, у фондах НПГКМЗ

***І. П. Воднева***

**Уступны артыкул**

Скончылася Вялікая Айчынная вайна, якая прынесла нашай краіне незлічоныя страты. У складаных умовах , пры амаль што поўнасцю разбуранай прамысловасці і сельскай гаспадарцы, найвялікшых людскіх ахвярах, пачалося пасляваеннае аднаўленне народнай гаспадаркі рэспублікі. У сакавіку 1946 г. быў прыняты Закон аб чацвёртым пяцігадовым плане. І менавіта перыядычны друк стаў не толькі летапісцам, але і непасрэдным удзельнікам адбудовы прадпрыемстваў і калгасаў, школ і інстытутаў, бальніц і тэатраў. У сувязі з гэтым кіраўніцтва краіны прыняло шэраг пастаноў і загадаў, у якіх прапаноўвалася палепшыць якасць і колькасць выданняў. У выніку аб'ём усіх газет быў павялічаны ў 2 разы (замест дзвюх палос стала чатыры). Было прапанавана прыцягваць шырокі аўтарскі актыў з ліку кіраўнікоў прадпрыемстваў, інжынераў, аграномаў, перадавых рабочых, дзеячаў навукі, культуры, мастацтва. Была ўстаноўлена структура штатнага раскладу для кожнай катэгорыі газет, у выніку чаго павялічылася колькасць аддзелаў, а, адпаведна, і колькасць творчых работнікаў рэдакцый. Самі газеты сталі шырока выкарыстоўваць розныя публіцыстычныя жанры і ўводзіць новыя формы масавай работы – агляды, пераклічкі, вытворчыя нарады і канферэнцыі, рабкораўскія пасты і інш.

На тэрыторыі Беларусі газеты выдаваліся самыя розныя. З кожным годам павялічваўся не толькі іх тыраж , але і колькасць. Гэта можна прасачыць у наступнай табліцы.

| год | 1946 | 1952 | 1956 | 1959 | да 1965 | да 1975 |
|---|---|---|---|---|---|---|
| рэспублік. | 10 | 10 | 10 | | 11 | 11 |
| абласных | 11 | 12 | 7 | | 6 | 6 |
| гарадскіх | 10 | | | | 2 | 2 |
| раённых | 161 | 174 | 175 | | 106 | 106 |
| аб'яднаных | | | | | 11 | 11 |
| галіновых | 4 | 14 | | | | |
| шматтыраж-ных | | | 20 | болей 70 | | |
| палітгаддз. МТС (Зах. Беларусі) | | 123 | | | | |
| агульны тыраж | 814 тыс. | звыш 1 млн. | 1353,8 òûñ. | 1696 тыс. | звыш 4 млн. | болей 5 млн. |

На старонках рэспубліканскіх, абласных, раённых газет на першым месцы заўсёды былі матэрыялы пра дасягненні ў народнай гаспадарцы. Там друкаваліся матэрыялы пра адбудовы заводаў і калгасаў, навіны з жыцця як вялікіх будоўляў краіны, так і поспехі звычайных калгаснікаў, будаўнікоў, інжынераў. Далей асвятляліся навіны медыцыны, адукацыі, культурнага жыцця, фізкультуры і спорту. На апошняй старонцы звычайна друкаваліся парады, аб'явы, рэклама. У гады першай пасляваеннай пяцігодкі супрацоўнікі рэдакцый газет шырока асвятлялі сацыялістычныя спаборніцтвы, у якія ўключылася ўся краіна. У рэдакцыі прыходзіла шмат пісьмаў, правараздач, паведамленняў аб перадавіках. У сваю чаргу выданні сачылі за развіццём падзей да канца, праводзілі праверкі іх вынікаў. Так, напрыклад, газета «Звязда» змясціла за 1974–1975 гг. звыш 40 матэрыялаў такіх праверак. Некаторыя газеты бралі шэфства над буйнейшымі будоўлямі рэспублікі, стваралі пастаянныя дзеючыя пасты рабкораў, рыхтавалі спецвыпускі газет. Напрыклад, газета «Звязда» вяла шэфства над нафтаперапрацоўчымі заводамі ў Наваполацку і Мазыры, над меліяратарамі Палесся.

На працягу з 6-ай па 11-ую пяцігодку (1956–1980) перыядычны друк заставаўся ініцыятарам многіх пачынаў, уме-

лым прапагандыстам перадавых метадаў працы, актыўным у асвятленні жыцця як у горадзе, так і ў вёсцы. Так, на старонках газет друкаваліся артыкулы кіраўнікоў прадпрыемстваў і калгасаў, перадавікоў вытворчасці. Змяшчалася шмат фотаздымкаў, на якіх яскрава перадаваліся самыя значныя моманты з жыцця краіны. У 1970-я гады друк Беларусі шырока прымяняў формы работы 20–30-х гг., якія набывалі новае асэнсаванне – семінары, прэс-канферэнцыі, школы журналісцкага майстэрства, аб'яднаныя тэматычныя лятучкі, курсы перападрыхтоўкі, гутаркі за «круглым сталом», выяздныя рэдакцыі, сустрэчныя планы і інш.

Усё новае і цікавае заўсёды знаходзіла месца на старонках газет. У 1950–60-я гг. перыядычныя выданні пісалі пра актыўнае развіццё хімічнай прамысловасці, у тым ліку Салігорскі калійны камбінат, Полацкі нафтаперапрацоўчы завод і інш; паведамлялі пра ўзнікненне зусім новых галін прамысловасці – мінеральных угнаенняў, электроннай, бваўнянай, нафтаздабываючай. Друк Беларусі шмат увагі надаваў паказу дасягненняў беларускіх вучоных, навукі як вытворчай сілы, пісаў пра дагаворы аб супрацоўніцтве паміж вучонымі Беларускага політэхнічнага інстытута і калектывамі МАЗа і МТЗ, Мінскім радыётэхнічным інстытутам і ВТА «Гарызонт» і інш. Супрацоўніцтва прыносіла добрыя вынікі.

Пісалі газеты і пра развіццё тэатра, музыкі, выяўленчага мастацтва, спорту. На сваіх старонках перыядычныя выданні шырока папулярызавалі творы вядомых беларускіх пісьменнікаў Я. Коласа, П. Броўкі, М. Танка, А. Куляшова і інш.

Друк актывізаваў сваю ролю ў час падрыхтоўкі да юбілейных дат, звязаных з гістарычным мінулым нашай краіны: 50-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі (1967 г.), 50-годдзя БССР і КПБ (1969 г.), 100-годдзя з дня нараджэння Ул.І. Леніна (1970 г.), 50-годдзя СССР (1972 г.), 30-годдзя з дня Перамогі над фашысцкай Германіяй (1975 г.). Газеты ўводзілі новыя рубрыкі, выступалі з перадавымі артыкуламі. У 1978 г. газеты актыўна абмяркоўвалі прыняцце новай Канстытуцыі.

Крытычныя артыкулы пра недахопы ў развіцці перыядычнага друку таксама мелі месца на старонках рэспубліканскіх і

абласных газет. Матэрыялы публікавалі ў рубрыках «На газетныя тэмы», дзе даваліся парады і рэкамендацыі. Для павышэння кваліфікацыі рэдактараў і сакратароў пры рэдакцыях гэтых газет стваралі месячныя курсы.

У канцы 1960-ых – пач. 1980-ых гг. у рэспубліцы з'явіліся і непадцэнзурныя рукапісныя і друкаваныя выданні, так званы самвыздат. Яны выходзілі ў Мінску, абласных або раённых цэнтрах. Яны маглі выдавацца і за мяжой, напрыклад, у Беластоку, Маскве, Рызе, Таліне. Матэрыялы ў іх друкаваліся на беларускай, рускай, украінскай мовах, часта лацінкай. Некаторыя з іх выходзілі афіцыйна.

Такім чынам, перыядычны друк у перыяд з 1945-га па 1980-ы гады меў даволі шырокі размах. Газеты, у якія прыйшло працаваць шмат прафесіяналаў, паступова выходзілі на перадавое месца ў асвятленні найбольш значных падзей з жыцця вёскі, горада, вобласці і краіны ў цэлым. У пасляваенны перыяд у Беларусі пачало выходзіць шмат новых выданняў: «Савецкі селянін» (1945), «Зорька» (1945), «Большэвіцкі сцяг» (1944), «Настаўніцкая газета» (1945), «Во славу Родины» (1947), «Мінская праўда» (1950), «Фізкультурнік Беларусі» (1951), «Советский медик (1955), «Журналіст» (1959), «Знамя юности» (1956), «Сельская газета» (1962) і інш.

Калекцыя газет, якая захоўваецца ў фондах НПГКМЗ і ўвайшла ў дадзены каталог, налічвае 168 адзінак, з якіх 166 – асноўнага фонду і 2 – дапаможнага. Большасць перыядычных выданняў складаюць нашы мясцовыя газеты: «Сцяг камунізму» і «Большавіцкі сцяг», якія былі перададзены ў складзе асабістых калекцый І.П. Дэйніса, М.А. Маніса, К.В. Жарнасека (гл. дадатак). Частка газет экспануецца ў музеях запаведніка (Музей беларускага кнігадрукавання – 3, Музей-кватэра З.М. Тусналобавай-Марчанка – 4). Газеты дадзенага перыяду выкарыстоўваюцца на выставах, служаць крыніцамі навуковых прац, дапамагаюць у вывучэнні гісторыі Полаччыны.

**Каталог газет.**

**«Большэвіцкі сцяг»** – орган Полацкага абласнога і гарадскога камітэтаў КП(б)Б, абласнога і гарадскога саветаў

дэпутатаў працоўных. Газета выходзіла з верасня 1944 па люты 1954 года. Была закрыта ў сувязі са скасаваннем Полацкай вобласці. З 1946 года газета выдавалася 5 разоў на тыдзень на беларускай мове. З 1948 г. паралельна пачала выдавацца аднайменная газета на рускай мове *«Большевистское знамя»*. У розныя гады рэдактарамі газеты былі А.Ц. Васілеўскі, Д.М. Каплун, Г.В. Фралоў, В. Каліберaў. Газета друкавала матэрыялы на тэмы «Па краіне», «Навіны вобласці», «Развіццё прамысловасці і сельскай гаспадаркі Полаччыны», «Навіны культуры і спорту», пісала аб прапагандысцкай і выхаваўчай рабоце, друкавала інтэрв'ю, нарысы, урыўкі з мастацкіх твораў. У рубрыцы *«Літаратурная старонка»* змяшчала вершы і апавяданні пачынаючых пісьменнікаў і паэтаў Полацкай вобласці. З №234 ад 26.11.1952 г. газета змяніла сваю назву на *«Сцяг камунізма»*. А з 3 лютага 1954 года стала толькі гарадскім друкаваным органам.

**1. «Большэвіцкі сцяг»**, № 58 (225), серада, 10.04.1946 г. Орган Полацкага абкома і гаркома КП(б)Б, абласнога і гарадского Саветаў дэпутатаў працоўных. Адказны рэдактар Д.М. Каплун. Полацкая абласная друкарня. Полацк, 1946 г.

Навіны па краіне, загады кіраўніцтва, с. 1.

Матэрыялы пра сацыялістычнае спаборніцтва да 1 Мая і Дня Перамогі, с. 1.

Справаздача па вобласці да святаў, с. 1.

М. Маніс, старшыня абласной планавай камісіі, «Рашуча палепшыць работу прадпрыемстваў промкааперацыі», с. 2.

«Баявыя задачы газеты» (крытычны артыкул пра «Большэвіцкі сцяг», перадрукаваны з газеты «Звязда»), с. 2.

Міжнародныя навіны, с. 2.

**ПГКЗ КП14-11565**

**2. «Большэвіцкі сцяг»**, № 110 (277), нядзеля, 30.06.1946 г. Орган Полацкага абкома і гаркома КП(б)Б, абласнога і гарадского Саветаў дэпутатаў працоўных. Адказны рэдактар Д.М. Каплун. Полацкая абласная друкарня. Полацк, 1946 г.

«Якуб Колас – лаўрэат Сталінскай прэміі», с. 1.

П. Шадзеўскі «Гэтыя дні не згаснуць у вяках» ( пра выстаўку ў Мінскім музеі Вялікай Айчыннай вайны, дзе было прадстаўлена шмат полацкіх газет), с. 2.

М. Маніс «Полацк» (гістарычны агляд), с. 2.

**ПГКЗ КП14-11577**

**3. «Большэвіцкі сцяг»**, № 113 (280), пятніца, 5.07.1946 г. Год выдання 3-ці. Орган Полацкага абкома і гаркома КП(б)Б, абласнога і гарадскога Саветаў дэпутатаў працоўных. Адказны рэдактар Д.М. Каплун. Полацкая абласная друкарня. Полацк, 1946 г.

Артыкулы пра поспехі ў эканоміцы, сельскай гаспадарцы, культуры на Полаччыне, с.1.

Навіны па краіне, с.1.

Міжнародныя навіны, с. 2.

М. Маніс «Полацк» (працяг), с. 2.

**ПГКЗ КП14-11578**

**4. «Большэвіцкі сцяг»**, №143 (309), чацвер, 22.08.1946 г. Год выдання 3-ці. Орган Полацкага абкома і гаркома КП(б)Б, абласнога і гарадскога Саветаў дэпутатаў працоўных. Адказны рэдактар Д.М. Каплун. Полацкая абласная друкарня. Полацк, 1946 г.

Навіны па краіне, с. 1.

Навіны с/г Полаччыны, с.1-2.

М. Маніс «Полацк» (працяг), с.2.

Міжнародныя навіны, с.3.

**ПГКЗ КП14-11566**

**5. «Большэвіцкі сцяг»**, № 143 (309), чацвер, 22.08.1946 г. Год выдання 3-ці. Орган Полацкага абкома і гаркома КП(б)Б, абласнога і гарадскога Саветаў дэпутатаў працоўных. Адказны рэдактар Д.М. Каплун. Полацкая абласная друкарня. Полацк, 1946 г.

**ПГКЗ КП14-11567**

**6. «Большэвіцкі сцяг»**, № 143 (309), чацвер, 22.08.1946 г. Год выдання 3-ці. Орган Полацкага абкома і гаркома КП(б)Б, абласнога і гарадскога Саветаў дэпутатаў працоўных. Адказны рэдактар Д.М. Каплун. Полацкая абласная друкарня. Полацк, 1946 г.

**ПГКЗ КП14-11579**

**7. «Большэвіцкі сцяг»**, № 174 (341), субота, 5.10.1946 г. Год выдання 3-ці. Орган Полацкага абкома і гаркома КП(б)Б, абласнога і гарадскога Саветаў дэпутатаў працоўных. Адказны рэдактар Д.М. Каплун. Полацкая абласная друкарня. Полацк, 1946 г.

Матэрыялы пра поспехі ў с/г вобласці, с. 1.

М. Маніс «Усе сілы на паспяховае выкананне 5-гадовага плана аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі вобласці. Поўнасцю выканаць праграму 1946 года – першага года пяцігодкі», с. 2.

Лісты ў рэдакцыю, с. 2.

Міжнародныя навіны, с. 2.

**ПГКЗ КП14-11572**

**8. «Большэвіцкі сцяг»**, № 210 (377), нядзеля, 24.11.1946 г. Год выдання 3-ці. Орган Полацкага абкома і гаркома КП(б)Б, абласнога і гарадскога Саветаў дэпутатаў працоўных. Адказны рэдактар Д.М. Каплун. Полацкая абласная друкарня. Полацк, 1946 г.

«Дзень сталінскай артылерыі», с. 1.

П. Шванкоў «У артылерыйскім гістарычным музеі», с. 1.

Загад Н. Булганіна па Дню артылерыі, с. 1.

М. Маніс «Як партызаны нямецкую гармату ў палон захапілі», с. 2.

Міжнародныя навіны, с. 2.

**ПГКЗ КП17-17924**

**9. «Большэвіцкі сцяг»**, № 53 (456), субота, 15.03.1947 г. Год выдання 4-ты. Орган Полацкага абкома і гаркома КП(б)Б, абласнога і гарадскога Саветаў дэпутатаў працоўных. Адказны

рэдактар Д.М. Каплун. Полацкая абласная друкарня. Полацк, 1947 г.

Навіны па краіне, с. 1.

Навіны партыйнага жыцця і ЦК ЛКСМБ, с. 1.

М. Маніс «Аповесць аб сапраўдным чалавеку», с. 2.

**ПГКЗ КП14-11580**

**10. «Большэвіцкі сцяг»**, № 125 (526), аўторак, 24.06.1947 г. Год выдання 4-ты. Орган Полацкага абкома і гаркома КП(б)Б, абласнога і гарадскога Саветаў дэпутатаў працоўных. Адказны рэдактар Г.В. Фралоў. Полацкая абласная друкарня. Полацк, 1947 г.

Матэрыялы пра сенакос і загатоўку кармоў, пра адбудову дамоў для сельскага насельніцтва, с. 1.

М. Маніс «Ноч палкаводца» ( пра кнігу Г. Бярозкі «Ноч палкаводца»), с. 2.

Міжнародныя навіны, с. 2.

**ПГКЗ КП14-11581**

**11. «Большэвіцкі сцяг»**, № 182 (583), пятніца, 12.09.1947 г. Год выдання 4-ты. Орган Полацкага абкома і гаркома КП(б)Б, абласнога і гарадскога Саветаў дэпутатаў працоўных. Адказны рэдактар Г.В. Фралоў. Полацкая абласная друкарня. Полацк, 1947 г.

Міжнародныя навіны, с. 1.

Навіны па краіне і вобласці, с. 1.

М. Маніс «Вецер з поўдня» (пра кнігу Э. Грына «Вецер з поўдня»), с. 2.

**ПГКЗ КП14-11564**

**12. «Большэвіцкі сцяг»**, № 111 (772), аўторак, 8.06.1948 г. Год выдання 5-ты. Орган Полацкага абкома і гаркома КП(б)Б, абласнога і гарадскога Саветаў дэпутатаў працоўных. Адказны рэдактар Г.В. Фралоў. Полацкая абласная друкарня. Полацк, 1948 г.

«Раённая партыйная школа» (г. Дзісна), с. 1.

«Шырыць спаборніцтва за дастойную сустрэчу 30-годдзя БССР» (матэрыялы пра агульны сход стаханаўцаў г. Полацка), с. 1.

«Сацыялістычныя абязацельствы прадпрыемстваў горада», с. 1.

«Трэці выпуск Расонскай партшколы» (сярод паведамленняў з фотаздымкамі артыкул С. Клокава, выкладчыка гісторыі ВКП(б) «Крыніца натхнення»), с. 2.

Міжнародныя навіны, с. 2.

**ПИАЗ КП9-5591**

**13. «Большэвіцкі сцяг»**, № 253 (914), субота, 25.12.1948 г. Год выдання 5-ты. Орган Полацкага абкома і гаркома КП(б)Б, абласнога і гарадскога Саветаў дэпутатаў працоўных. Намеснік адказнага рэдактара П.П. Бяляўскі. Полацкая абласная друкарня. Полацк, 1948 г.

«За далейшы ўздым прамысловай вытворчасці» (пра поспехі прадпрыемстваў горада да 30-годдзя БССР), с. 1.

«У Дунілавіцкім раёне», с. 1.

«Пра жыццё калгаснікаў», с. 2.

Міжнародныя навіны, с. 2.

**ПГКЗ КП15-12981**

**14. «Большэвіцкі сцяг»**, № 254 (915), нядзеля, 26.12.1948 г. Год выдання 5-ты. Орган Полацкага абкома і гаркома КП(б)Б, абласнога і гарадскога Саветаў дэпутатаў працоўных. Намеснік адказнага рэдактара П.П. Бяляўскі. Полацкая абласная друкарня. Полацк, 1948 г.

«Насустрач 30-годдзю Беларускай ССР» (паведамленні пра прадпрыемствы і с/г горада і раёна), с. 1.

М. Маніс «Полоцк возрождается» (развіццё горада з 862 па 1948 гг.), с. 2.

**ПГКЗ КП14-11568**

**15. «Большэвіцкі сцяг»**, № 254 (915), нядзеля, 26.12.1948 г. Год выдання 5-ты. Орган Полацкага абкома і гаркома КП(б)Б, абласнога і гарадскога Саветаў дэпутатаў працоўных. Намеснік

адказнага рэдактара П.П. Бяляўскі. Полацкая абласная друкарня. Полацк, 1948 г.

**ПГКЗ КП15-12980**

**16. «Большэвіцкі сцяг»**, № 254 (915), нядзеля, 26.12.1948 г. Год выдання 5-ты. Орган Полацкага абкома і гаркома КП(б)Б, абласнога і гарадскога Саветаў дэпутатаў працоўных. Намеснік адказнага рэдактара П.П. Бяляўскі. Полацкая абласная друкарня. Полацк, 1948 г.

**ПГКЗ КП14-11570**

**17. «Большэвіцкі сцяг»**, № 254 (915), нядзеля, 26.12.1948 г. Год выдання 5-ты. Орган Полацкага абкома і гаркома КП(б)Б, абласнога і гарадскога Саветаў дэпутатаў працоўных. Намеснік адказнага рэдактара П.П. Бяляўскі. Полацкая абласная друкарня. Полацк, 1948 г.

**ПГКЗ КП14-11569**

**18. «Большэвіцкі сцяг»**, № 254 (915), нядзеля, 26.12.1948 г. Год выдання 5-ты. Орган Полацкага абкома і гаркома КП(б)Б, абласнога і гарадскога Саветаў дэпутатаў працоўных. Намеснік адказнага рэдактара П.П. Бяляўскі. Полацкая абласная друкарня. Полацк, 1948 г.

**ПГКЗ КП15-13188**

**19. «Большэвіцкі сцяг»**, № 40 (1216), чацвер, 23.02.1950г. Год выдання 7-мы. Орган Полацкага абкома і гаркома КП(б)Б, абласнога і гарадскога Саветаў дэпутатаў працоўных. Адказны рэдактар Г.В. Фралоў. Полацкая абласная друкарня. Полацк, 1950 г.

Матэрыялы да 32-гадавіны Савецкіх Узброеных Сіл, с.1–4.

«Надзейны вартавы краіны Саветаў» (з партрэтам І.В. Сталіна), с. 1.

Загад Міністэрства Узброеных Сіл СССР А.М. Васілеўскага (з партрэтам), с. 1.

Рубрыка «З гераічнага мінулага воінаў Савецкай Арміі» (матэрыялы пра З.М. Тусналобаву-Марчанка), с. 3.

Міжнародныя навіны, аб’явы, с. 4.

**ПИАЗ КП7-3731**

**20. «Большэвіцкі сцяг»**, № 166 (1342), нядзеля, 20.08.1950 г. Год выдання 7-мы. Орган Полацкага абкома і гаркома КП(б)Б, абласнога і гарадскога Саветаў дэпутатаў працоўных. Адказны рэдактар Г.В. Фралоў. Полацкая абласная друкарня. Полацк, 1950 г.

Матэрыялы пра поспехі ў с/г вобласці, с. 1–2.

«Літаратурная старонка» (вершы Н. Пракофьевай, М. Булаўкі, Л. Авербаха, Т. Сцяпанавай, Б. Карташова, артыкул пра партызанскі фальклор П. Святлова, апавяданне А. Савіцкага «Песня баяна»), с. 2.

Міжнародныя навіны, с. 4.

Навіны культуры і спорту (па вобласці), с._4.

**НПГКМЗ КП19-24367**

**21. «Большэвіцкі сцяг»**, № 216 (1392), нядзеля, 29.10.1950 г. Год выдання 7-мы. Орган Полацкага абкома і гаркома КП(б)Б, абласнога і гарадскога Саветаў дэпутатаў працоўных. Адказны рэдактар Г.В. Фралоў. Полацкая абласная друкарня. Полацк, 1950 г.

«Усямерна прасоўваць кнігу ў масы», с. 1.

«Аб выніках дзяржплана развіцця н/г БССР за 3-ці квартал», с. 1.

Р. Ракітны «Дружба народаў – магутная рухаючая сіла савецкага грамадства», с. 2.

Матэрыялы аб поспехах у с/г, с. 2.

«Літаратурная старонка» ( вершы В. Гаралевіча, Н. Пракофьевай, М. Матыля, Л. Авербаха, А. Кісяля, М. Булаўкі, Б. Карташова, Р. Еўдакімава, басня Л. Жогалевай, артыкул А. Савіцкага), с. 3.

Міжнародныя навіны, с. 4.

**НПГКМЗ КП19-24368**

**22. «Большэвіцкі сцяг»**, № 103, нядзеля, 25.05.1952 г. Год выдання 9-ты. Орган Полацкага абкома і гаркома КП(б)Б,

абласнога і гарадскога Саветаў дэпутатаў працоўных. Намеснік рэдактара М.Н. Башлакоў. Полацкая абласная друкарня. Полацк, 1950 г.

«Вышэй ролю агранома ў барацьбе за ўраджай», с. 1.

«Аб мерах па ўмацаванню кармавой базы для грамадзян жывёлагадоўлі ў калгасах і саўгасах БССР у 1952 г.», с. 1.

М. Маніс «Некаторыя вынікі палітычнай самаадукацыі камуністаў», с. 2.

Навіны па краіне, раёну і гораду, с. 2–4.

Міжнародныя навіны, с. 4.

**ПГКЗ КП14-11571**

**«Большевистское знамя»** – орган Полацкага абкома і гаркома КП(б)Б, абласнога і гарадскога Саветаў дэпутатаў працоўных. Выдавалася са студзеня 1948 па лістапад 1952 года на рускай мове 5 разоў на тыдзень. Газета дубліравала беларускамоўную газету *«Большэвіцкі сцяг».*

**23. «Большевистское знамя»**, № 130 (191), нядзеля, 4.07.1948 г. Год выдання 5-ты. Орган Полацкага абкома і гаркома КП(б)Б, абласнога і гарадскога Саветаў дэпутатаў працоўных. Нам. адказнага рэдактара П.П. Бяляўскі. Полацкая абласная друкарня. Полацк, 1948 г.

«Решительно поднять темпы уборки и сдачи сена государству», с. 1.

«Соревнования Витебских и Полоцких хлеборобов», с. 1.

«Торжественное заседание, посвящённое четвёртой годовщине освобождения Белоруссии», с. 1.

«Сельскохозяйственная выставка», с. 1.

М. Маніс «Полоцк возрождается», с. 1.

Л. Габовіч «Ликвидация неграмотности», с. 1.

Н. Чыгак «Обязательство дисненских учителей», с. 1.

«О тематике районной газеты» (пра міёрскую газету «Большэвіцкая трыбуна»), с. 2.

Міжнародныя навіны ў рубрыцы «За рубежом», с. 2.

Артыкул І. Леўтава пра вызвыленне Беларусі, с. 2.

**ПИАЗ КП7-4318**

**24. «Большевистское знамя»**, № 254 (915), нядзеля, 26.12.1948 г. Год выдання 5-ты. Орган Полацкага абкома і гаркома КП(б)Б, абласнога і гарадскога Саветаў дэпутатаў працоўных. Намеснік адказнага рэдактара П.П. Бяляўскі. Полацкая абласная друкарня. Полацк, 1948 г.

«Насустрач 30-годдзю Беларускай ССР» (паведамленні пра прадпрыемствы і с/г горада і раёна), с. 1.

М. Маніс «Полацк возрождается» (развіццё горада з 862 па 1948 г.), с. 2.

**ПГКЗ КП14-11608**

**25. «Большевистское знамя»**, № 1 (919), субота, 01.01.1949 г. Год выдання 6-ты. Орган Полацкага абкома і гаркома КП(б)Б, абласнога і гарадскога Саветаў дэпутатаў працоўных. Намеснік адказнага рэдактара П.П. Бяляўскі. Полацкая абласная друкарня. Полацк, 1949 г.

«Президиуму Верховного Совета БССР, Совету Министров БССР, ЦК КП(б)Б», с. 1.

«Прибытие в Минск Председателя Президиума Верховного Совета СССР Н.М. Шеверника», с. 1.

Н. Гусараў «Славное тридцатилетие», с. 2.

«Прибытие делегаций братских республик в Минск», с. 2.

А. Александровіч «Почётный труд», с. 3.

А. Шыпко «На пути к расцвету», с. 3.

«Так стало сейчас», с. 4.

**ПИАЗ КП7-4317**

**26. «Большевистское знамя»**, № 176 (1094), аўторак, 06.09.1949 г. Год выдання 6-ты. Орган Полацкага абкома і гаркома КП(б)Б, абласнога і гарадскога Саветаў дэпутатаў працоўных. Намеснік адказнага рэдактара П.П. Бяляўскі. Полацкая абласная друкарня. Полацк, 1949 г.

Артыкулы пра поспехі ў развіцці с/г і прамысловасці вобласці, с. 1.

Лісты ў рэдакцыю ад чытачоў аб праблемах па вобласці, с. 2.

Міжнародныя навіны, с. 2.

А. Савіцкі «Хирург» (пра урача г.Полацка Ісака Якаўлевіча Крыстала), с. 2.

**ПИАЗ КП3-991**

**«Большэвіцкі шлях»** – орган Полацкага РК КП(б)Б і раённага Савета дэпутатаў працоўных. Газета пачала выдавацца з 1938 года. Падчас Вялікай Айчыннай вайны, з 26.06.1941 г. па 1.06.1943 г., не выходзіла. Да 7.05.1944г. выдавалася падпольна ў партызанскай брыгадзе. З 6.07.1944г. газета, працягнуўшы ранейшую нумарацыю, аднавіла сваё выданне ўжо ў вызваленым горадзе. Выдавалася пад такой назвай да снежня 1952 года, на беларускай мове, 2 разы на тыдзень, у Полацкай друкарні. У пасляваенны перыяд рэдактарамі газеты былі П.А. Шадзеўскі, Я.У. Гінзбург. Друкавала матэрыялы пра развіццё с/г Полаччыны, навіны па краіне і за мяжою, пісала пра перадавікоў жніва, поспехі і недаробкі, публікавала шмат фотаздымкаў, падтрымліваючы сувязі з БЕЛТА. Са снежня 1952 г. раённая газета пачала выходзіць пад назвай *«Сталінскі шлях»*, апошні нумар якой выйшаў у пачатку 1956 года.

**27. «Большэвіцкі шлях»**, № 44–45, субота, 29.05.1948 г. Орган Полацкага РК КП(б)Б і раённага Савета дэпутатаў працоўных. Рэдактар Я.В. Гінзбург. Полацкая друкарня. Полацк, 1948 г.

*Газета прысвечана юбілею раённай газеты.*

Т. Хадкевіч «Слаўныя традыцыі», с. 2.

М. Смолкін «Самуйлёнак – журналіст», с. 3.

П. Шадзеўскі «Большэвіцкі шлях у падполлі», с. 3.

**ПГКЗ КП15-12979**

**«Віцебскі рабочы»** – орган Віцебскага абкома і гаркома КПБ, абласнога і гарадскога саветаў дэпутатаў працоўных. З канца чэрвеня 1944 года пачала выходзіць у вызваленым ад фашыстаў г.Віцебску, на беларускай мове. Рэдактарамі газеты ў розныя гады былі М. Пахомаў (1954–1956), П.П. Бляўскі (1956–1963), А.Ф. Пазняк (1965–1967(?)), М.У. Дарафеенка (1970–1983). У 1944 г. перыядычнасць газеты была 2 разы на

тыдзень, у 1945 г. – 3 разы, з 1946 г. – 5 разоў. У 1944–1945 гг. газета шмат увагі надавала паведамленням з фронту, поспехам Чырвонай Арміі за мяжой, але шмат месца адводзілася і пад матэрыялы пра аднаўленне разбураных падчас акупацыі прамысловых прадпрыемстваў, камунальнай гаспадаркі, жылля, вучэбны устаноў. У 1950–60-я гг. газета многа пісала пра поспехі ў культурным жыцці горада і вобласці, аб шчаслівых і трагічны падзеях простых гараджан і працаўнікоў вёскі, пра цікавых гасцей горада з ліку вядомых людзей нашай тагачаснай краіны, друкавала рэцэнзіі на кнігі і спектаклі. 18 лістапада 1967 года газета была ўзнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**28. «Віцебскі рабочы»**, № 242 (10315), субота, 7.12.1957 г. Год выдання 41-ы. Орган Віцебскага абкома і гаркома КПБ, абласнога і гарадскога саветаў дэпутатаў працоўных. Рэдактар П. Бяляўскі. Друкарня імя Камінтэрна. Віцебск, 1957 г.

«Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб прысваенні звання Героя Совецкага Саюза Тусналобавай-Марчанка З.М.», с. 1.

«Подзвіг Зінаіды Тусналобавай», с. 1.

Навіны па Саюзу, с.1.

А. Карагін «Камунізм – наша светлае заўтра», с. 2–3.

М. Раманаў «Газета – лепшы памочнік» (пра падпіску ў калгасе «Чырвоная Армія» Сіроцінскага раёна), с. 3.

Артыкулы пра поспехі і недаробкі ў калгасах вобласці, с. 2–3.

Міжнародныя навіны, с. 4.

**ПИАЗ КП8-4415**

**29. «Віцебскі рабочы»**, № 101 (11511), аўторак, 22.05.1962 г. Год выдання 46-ы. Орган Віцебскага абкома і гаркома КПБ, абласнога і гарадскога саветаў дэпутатаў працоўных. Рэдактар П. Бяляўскі. Друкарня імя Камінтэрна. Віцебск, 1962 г.

М.А. Маніс «Старажытнейшы на Русі» (пра г. Полацк), с. 3.

**ПГКЗ КП14-11615**

**30. «Віцебскі рабочы»**, № 108 (11518), пятніца, 1.06.1962 г. Год выдання 46-ы. Орган Віцебскага абкома і гаркома КПБ, абласнога і гарадскога саветаў дэпутатаў працоўных. Рэдактар П. Бяляўскі. Друкарня імя Камінтэрна. Віцебск, 1962 г.

М.А. Маніс «Старажытнейшы на Русі» (працяг), с. 3.

М. Пруднікаў «Юны партызан» (пра Жэню Гарбачэўскага з в.Узніца, Полацкага раёна), с. 2.

**ПГКЗ КП14-11614**

**31. «Віцебскі рабочы»**, № 111 (11521), пятніца, 5.06.1962 г. Год выдання 46-ы. Орган Віцебскага абкома і гаркома КПБ, абласнога і гарадскога саветаў дэпутатаў працоўных. Рэдактар П. Бяляўскі. Друкарня імя Камінтэрна. Віцебск, 1962 г.

М.А. Маніс «Старажытнейшы на Русі» (працяг), с. 3.

**ПГКЗ КП14-11616**

**32. «Віцебскі рабочы»**, № 120 (11530), нядзеля, 17.06.1962 г. Год выдання 46-ы. Орган Віцебскага абкома і гаркома КПБ, абласнога і гарадскога саветаў дэпутатаў працоўных. Рэдактар П. Бяляўскі. Друкарня імя Камінтэрна. Віцебск, 1962 г.

М.А. Маніс «Старажытнейшы на Русі» (працяг), с. 3.

**ПГКЗ КП14-11613**

**33. «Віцебскі рабочы»**, № 135(11545), нядзеля, 8.07.1962 г. Год выдання 46-ы. Орган Віцебскага абкома і гаркома КПБ, абласнога і гарадскога саветаў дэпутатаў працоўных. Рэдактар П. Бяляўскі. Друкарня імя Камінтэрна. Віцебск, 1962 г.

М.А. Маніс «Старажытнейшы на Русі» (працяг), с. 3.

**ПГКЗ КП14-11612**

**34. «Віцебскі рабочы»**, № 142 (11552), серада, 18.07.1962 г. Год выдання 46-ы. Орган Віцебскага абкома і гаркома КПБ, абласнога і гарадскога саветаў дэпутатаў працоўных. Рэдактар П. Бяляўскі. Друкарня імя Камінтэрна. Віцебск, 1962 г.

М.А. Маніс «Старажытнейшы на Русі» (працяг), с. 3–4.

**ПГКЗ КП14-11611**

**35. «Віцебскі рабочы»**, № 155 (11565), аўторак, 7.08.1962 г. Год выдання 46-ы. Орган Віцебскага абкома і гаркома КПБ, абласнога і гарадскога саветаў дэпутатаў працоўных. Рэдактар П. Бяляўскі. Друкарня імя Камінтэрна. Віцебск, 1962 г.

М.А. Маніс «Старажытнейшы на Русі» (працяг), с. 3.

І. Іскевіч «Чаму не адбыўся конкурс?» ( пра конкурс да 1100-годдзя г. Полацка), с. 3.

Г. Леанідаў «Кніга аб нашым краі» (пра кнігу С.М. Мельнікава «Віцебская вобласць»), с. 2.

**ПГКЗ КП14-11610**

**36. «Віцебскі рабочы»**, № 241 (12455), пятніца, 3.12.1965 г. Год выдання 49-ы. Орган Віцебскага абкома і гаркома КПБ, абласнога і гарадскога саветаў дэпутатаў працоўных. Рэдактар А.Ф. Пазняк. Друкарня імя Камінтэрна. Віцебск, 1965 г.

Навіны па краіне, поспехі ў прамысловасці і с/г, с. 1–4.

«Дазорных высокае прызванне. Другі абласны сход народных кантралёраў», с. 2.

Спіс узнагароджаных актывістаў партыйнага дзяржкантролю па Віцебскай вобласці (у тым ліку С.Р. Кюльбаха, намесніка старшыні Полацкага ГК партыйнага дзяржкантролю, з фотаздымкам), с. 2.

Міжнародныя навіны, с. 4.

Навіны спорту, культуры, с. 4.

**ПИАЗ КП7-3820**

**37. «Віцебскі рабочы»**, № 29 (12758), чацвер, 9.02.1967 г. Год выдання 51-ы. Орган Віцебскага абкома і гаркома КПБ, абласнога і гарадскога саветаў дэпутатаў працоўных. Рэдактар А.Ф. Пазняк. Друкарня імя Камінтэрна. Віцебск, 1967 г.

А.Н. Аксёнаў «Подзвігі ратныя, доблесць працоўная», с. 1–2.

Д. Райцаў «Попел і ружы» (пра герояў Вялікай Айчыннай вайны), с. 2–3.

«Яны праславілі свой край. Героі Савецкага Саюза – ураджэнцы Віцебшчыны» (З.М. Тусналобава-Марчанка, А.К. Гаравец, М.Ф. Сільніцкі і інш.), с. 2.

Навіны па краіне, с. 2.

Міжнародныя навіны, с. 4.

**ПИАЗ КП13-8330**

**38. «Віцебскі рабочы»**, № 29 (12758), чацвер, 9.02.1967 г. Год выдання 51-ы. Орган Віцебскага абкома і гаркома КПБ, абласнога і гарадскога саветаў дэпутатаў працоўных. Рэдактар А.Ф. Пазняк. Друкарня імя Камінтэрна. Віцебск, 1967 г.

**ПИАЗ КП13-8331**

**39. «Віцебскі рабочы»**, № 250 (13238), субота, 21.12.1968 г. Год выдання 52-і. Орган Віцебскага абкома і гаркома КПБ, абласнога і гарадскога саветаў дэпутатаў працоўных. Выязная рэдакцыя. Нумар падрыхтавалі Я. Рыклін, Л. Ізобава, А. Макеенка. Намеснік рэдактара П.І. Гомераў. Друкарня імя Камінтэрна. Віцебск, 1968 г.

Газета прысвечана г. Полацку.

П. Якаўлеў «Маладосць старажытнага горада» (адкрыццё Кургана бессмяротнасці), с. 1.

Аляксееў «Жывая легенда» (пра слаўных палачан), с. 2.

«Уступаюць у партыю байцы» (матэрыялы пра З.М. Тусналобаву-Марчанка), с. 2.

А.А. Баярская «Букет кветак» (пра падзеі 1917 года), с. 2.

М. Кірычак «Паэзія працы стваральнай» (да 10-годдзя полацкага завода «Шкловалакно»), с. 2.

«Нашы дасягненні», с. 3.

«Помнік неўміручасці» (пра Курган), с. 3.

«Такі герб горада», с. 3.

М. Пятрэнка «Край мой беларускі», с. 4.

**ПИАЗ КП3-913/34**

**40. «Віцебскі рабочы»**, № 189 (13693), чацвер, 24.09.1970 г. Год выдання 51-ы. Орган Віцебскага абкома і гаркома КПБ, абласнога і гарадскога саветаў дэпутатаў працоўных. Рэдактар М.У. Дарафеенка. Друкарня імя Камінтэрна. Віцебск, 1970 г.

Матэрыялы і паведамленні да 50-годдзя ЛКСМБ, с. 1–4.

Т. Касцюк «Ордэн на сцягу» (пра камсамольцаў г. Наваполацка), с. 2.

В. Ліхачоў «Ён слухаў Ільіча» (пра сустрэчу Г.С. Пятрова са студэнтамі с/г тэхнікума), с. 2.

С. Законнікаў, вершы, с. 2.

«Этапы вялікага шляху», с. 2–3.

**ПИАЗ КП13-8335**

**41. «Віцебскі рабочы»**, № 119 (14138), субота, 17.06.1972 г. Год выдання 53-і. Орган Віцебскага абкома і гаркома КПБ, абласнога і гарадскога саветаў дэпутатаў працоўных. Рэдактар М.У. Дарафеенка. Друкарня імя Камінтэрна. Віцебск, 1972 г.

Матэрыялы, прысвечаныя Дню медыцынскага работніка, с. 1.

З. Крупчанка «У імя жыцця» (пра Галіну Леанідаўну Вайткевіч, урача-хірурга г. Полацка), с. 2.

Міжнародныя навіны, с. 3.

**ПИАЗ КП5-2401/14**

**42. «Віцебскі рабочы»**, № 198 (14217), пятніца, 6.10.1972 г. Год выдання 53-і. Орган Віцебскага абкома і гаркома КПБ, абласнога і гарадскога саветаў дэпутатаў працоўных. Рэдактар У.Р. Скапа. Друкарня імя Камінтэрна. Віцебск, 1972 г.

А. Макеенка «Усё пачынаецца з настаўніка. Полацкаму педвучылішчу – 100 гадоў», с. 2.

Г. Кірылаў, К. Жарнасек «Глыбокія вытокі» (нататкі аб падарожжы па Заходняй Дзвіне), с. 4.

**НПГКМЗ КП20-25496**

**43. «Віцебскі рабочы»**, № 199 (14218), субота, 7.10.1972 г. Год выдання 53-і. Орган Віцебскага абкома і гаркома КПБ, абласнога і гарадскога саветаў дэпутатаў працоўных. Рэдактар У.Р. Скапа. Друкарня імя Камінтэрна. Віцебск, 1972 г.

Г. Кірылаў, К. Жарнасек «Глыбокія вытокі» (нататкі аб падарожжы па Заходняй Дзвіне), с. 4.

**НПГКМЗ КП20-25497**

**44. «Віцебскі рабочы»**, № 200 (14219), аўторак, 10.10.1972 г. Год выдання 53-і. Орган Віцебскага абкома і гаркома КПБ, абласнога і гарадскога саветаў дэпутатаў працоўных. Рэдактар У.Р. Скапа. Друкарня імя Камінтэрна. Віцебск, 1972 г.

Г. Кірылаў, К. Жарнасек «Глыбокія вытокі» (нататкі аб падарожжы па Заходняй Дзвіне), с. 4.

**НПГКМЗ КП20-25498**

**45. «Віцебскі рабочы»**, № 3 (14540), пятніца, 4.01.1974 г. Год выдання 55-ы. Орган Віцебскага абкома і гаркома КПБ, абласнога і гарадскога саветаў дэпутатаў працоўных. Рэдактар У.Р.Скапа. Друкарня імя Камінтэрна. Віцебск, 1974 г.

Г. Кірылаў, К. Жарнасек «З любасцю да роднага краю» (пра мастака П.А. Сергіевіча), с. 4.

**НПГКМЗ КП20-25499**

**46. «Віцебскі рабочы»,** № 250 (14787), пятніца, 20.12.1974 г. Год выдання 55-ы. Орган Віцебскага абкома і гаркома КПБ, абласнога і гарадскога саветаў дэпутатаў працоўных. Рэдактар М.У. Дарафеенка. Друкарня імя Камінтэрна. Віцебск, 1974 г.

Г. Кірылаў «След на зямлі» ( пра селекцыянера І.П. Сікору), с. 4.

**НПГКМЗ КП20-25500**

